Opłata pocztowa uiszczona ryczałtem.

№ 27 (56) Субота, 20-га жніўня 1927 г. м. Вільня. Год II.

# Беларускае Слова

Выходзіць раз у тыдзень Цана нумару 20 грош.

**Нацыянальнае адраджэньне. — Тэрыторыяльная і культурна-нацыянальная аутаномія. — Зямля сялянам на падставе уласнасьці. — Шырокі дэмократызм. — Бараньба з комунізмам. — Нацыянальная царква. — Краевая згода. — Далучэньне Усходняй Беларусі да Заходняй.**

Падпісная цана на 1 [illegible]
„ „ 3 „ [illegible] зл.
Заграніцу ўдвая даражэй.

Ад[illegible] Адміністрацыі: Wilno ul. Zawalna 6 m. 4
Рэд[illegible]ена ад 12 — 2 гадз. штодня апрача сьвятаў.

Цана абвестак: На 1 старане — 20 гр.
„ У тэксце . — 40 гр.
„ На 4 старане — 15 гр.
За кожны мілім. шырыны ў 1 шпальту.
Старана мае 8 шпальтаў.

## Балючая справа.

Ад момэнту, калі на чале Дзяржавы стаў Маршалак Пілсудзкі, кожны суменны чалавек павінен прызнаць, што ў многіх галінах грамадзкага жыцьця наступілі зьмены на лепшае і пэўныя палёгкі. Гэтыя зьмены з уздыхам палёгкі асабліва адчулі і нашыя занедбаныя беларускія землі. Бо хто-ж можа запярэчыць таму факту, што пляновая, упартая і жорсткая папярэдняя полёнізацыйная палітыка, калі ня сьціхла зусім, дык нязьмерна зьменшылася ў сваім імпэту.

Аслабла і зьнікла хваля чужацкага асадніцтва на нашыя землі; спыніліся шыканы на нашыя сярэднія школы, а нават Навагрудзкая гімназія адтрымала дзяржаўныя правы і субсыдыю; адтрыманы дазвол на вышэйшыя курсы з правамі ў Радашковічах для нашых беларускіх гімназіяльных настаўнікаў; перасталі зачыняць праваслаўныя цэрквы, а некатарыя, як напр., царква у Навагрудку, пры дапамозе ваяводы Бечковіча, адтрымала значную суму грошы на адбудову і рэмонт; біскуп віленскі Яблжыкоўскі выдаў за курыяльныя грошы каталіцкі катэхізіс у беларускай мове; значныя сумы грошаў былі адпушчаны Урадам на пацярпеўшых ад навальніцы і нарэшце мы маем сваіх першых войтаў, радных і сэймікавых прадстаўнікоў.

Гэтых фактаў ніхто, нават спрытная на падкрэсьліваньне толькі чорных старонак жыцьця беларусаў пад Польшчай — „Наша Справа" зьбіць ня здужае.

І толькі адно пытаньне, пытаньне найбольш балючае, найбольш для нас дарагое і патрэбнае, як паветра, — пытаньне аб беларускай пачаткавай школе засталося не разьвязаным!

Надыходзіць новы школьны год і нашыя беларускія дзеткі ня маюць сваей роднай школы. Два гады таму *яшчэ да маёвага перавароту* Беларускі Народ яскрава заманіфэставаў сваё жаданьне мець сваю родную школу, злажыўшы больш 1[illegible] тысячаў дэкларацыяў. Праўда, стары ўрад спужаўся гэтай хвалі зложаных дэкларацыяў і выслаў па усім вёскам і мястэчкам цэлую армію ўрадоўцаў і інспэктараў, якія *перараблялі* беларускія дэкларацыі на карысьць польскай школы. Але факт застаўся фактам: беларускі народ сваю волю выявіў. І мы чакаем ад міністра асьветы ўраду Маршалка Пілсудзкага, што і гэта найбольш балючае пытаньне будзе разьвязана.

Куратарыумы школьныя павыдавалі адозвы да насяленьня, дзе аб'яўляюць, што дзеці, якія радзіліся ад 1914—1920 году, павінны быць запісанымі да школаў пад пагрозамі адпавяданьня бацькоў прад судовай уладай. Дык насяленьне павінна на гэты загад зарэагаваць новым патрэбаваньнем роднай школы.

Мы лічым, што ня новымі рэпрэсыйнымі мерамі проціў бацькоў можа быць разьвязана пытаньне аб пачатковай школе, а *увядзеньнем той урадовай пачатковай школы, якой дамагаецца насяленьне.* Тады сама сабой зьнікне патрэбнасьць караньня бацькоў, а ў вёску пальецца сьвятло роднай асьветы, адзінай патрэбнай і зразумелай для дзетак у пачатковай школе.

## ПАЛІТЫЧНЫ АГЛЯД.

Першага жніўня споўнілася 13 гадоў з дня выбуху вялікай вайны, раны ад якой не залечаны яшчэ да гэтай пары. І трэба было здарыцца так, што з гэтым юбілеям сумных падзеяў саўпаў момэнт правалу марской конфэрэнцыі „трох" у Жэнэве, які не варожыць нічога добрага на будучыну.

**Правал жэнэўскай „конфэрэнцыі трох",**
цягнуўшайся з вялікімі труднасьцямі цэлых 7 тыдняў, наносіць вельмі моцны ўдар ідэі агульнага разбраеньня і міра, роўна як і прэстыжу Лігі Народаў, стоячай на стражы гэтай праблемы. У наступным месяцы ласьне мае адкрыцца ў Жэнэве конфэрэнцыя па пытаньню аб разбраеньні на сушы. І калі на „конфэрэнцыі трох" быўшых хаўрусьнікаў у часе вайны проці немцаў не дасягнута згода па пытаньню аб абмежаваньні марскіх ваaружэньняў, дык ня прыходзіцца ашуківаць сябе надзеямі, што ўдасца вырашыць праблему разбраеньня на сушы і ў паветры тым балей, што гэта праблема значна цяжэйшая і што пры гэтым будзе прымаць удзел Нямеччына, выразна незадаволеная істнуючым сьвятовым палітычным палажэньнем.

Сутнасьць разнагалосься між Англіяй і Амэрыкай заключаецца ў наступным: згаджаючыся на саатнашэньня, ўстаноўляныя на Вашынгтонскай конфэрэнцыі (5:5:3 для флётаў Англіі, Амэрыкі і Японіі), Амэрыка імкнулася сьвязьці марскія сілы другіх странаў на свой больш нізкі ровень, між тым як Англія, не пярэчачы проці таго, каб Амэрыка была пастаўлена ў роўныя з ею варункі, рахавала, што Амэрыка для гэтага павінна падняцца да ангельскага роўня. Найбольш спрэчным было пытаньне аб крэйсэрах, вельмі неабходных Англіі пры яе раскіданых па ўсяму сьвету калёніях і менш патрэбных для Амэрыкі пры яе большай тэрыторыяльнай кампактнасьці. Лёс флёта Зл. Штатаў паказвае, што недастатачна неабмяжованага багацтва для стварэньня першаклясная баявой сілы. Амэрыка з вялікім высілкам знаходзіць асабісты склад для свайго флёту і ласьне гэтыя матывы, а ня выдаткі на будову крэйсэраў устрымліваюць яе ад павялічэньня флёту. Але ёсьць яшчэ адзін паважны повад, не дазваляючы знайсьці выйсьця з бязвыхаднага палажэньня.

**Крэйсэр — гэта ні што іншае, як плятформа, на якой толькі ставяцца гарматы.**

Гандлёвы параход з пастаўлянымі на яго палюбе гарматамі з абслугаю найлепш выпаўняе ролю ваеннага крэйсэра. І чым гэты парахад будзе мець больш разьмер і шпаркасьць, тым большую будзе пасядаць баявую вартасьць. У мінуўшую вайну, як ведама, сотні гандлёвых параходаў былі пераварочаны ў гэткага рода ваенныя крэйсэры і з пасьпехам выпаўнялі свае заданьні. І вось тут акурат мы падыходзім да разгадкі, дзеля чаго Англія жадала паніжыць танаж крэйсэраў да 7,500 тонаў і гарматы на іх да 6 дзюймаў. Пры гэткіх варунках яна магла бы на выпадак вайны ўвесь свой гандлёвы флёт перавярнуць у ваенны. А дзеля таго, што Англія пасядае 2,800 гандлёвых параходаў, плаваючых з шпаркасьцю 12 вузлоў у гадзіну, а Зл. Штаты маюць гэткіх толькі 2,300. Затым далей Англія мае 1,300 параходаў з шпаркасьцю 14 вузлоў, а Амэрыка толькі 215 гэткіх параходаў; на 300 англійскіх параходаў з шпаркасьцю ад 15 да 19 вузлоў прыпадае толькі 50 амэрыканскіх і на 42 англійскіх параходаў, развіваючых шпаркасьць больш 20 вузлоў толькі 4 амэрыканскіх, і наагул гандлёвых параходаў з паемнасьцю больш 25,000 тонаў Англія мае 663, у той час як Амэрыка толькі 98, дык зразумела, што на выпадак вайны Амэрыка ня можа зраўняцца з Англіяй, тым больш, што апошняя мае вельмі шырокую практыку ў мабілізацыі гандлёвага флёта для ваенных мэтаў гэтак сама, як і цывільнай прамысловасьці для ваеннай пры адпаведным кадры абслугуючага пэрсоналю.

Што датычыцца Японіі, дык яна старалася адгуляць ролю пасрэдніка між Англіяй і Амэрыкаю. Яна высунула праэкт 4-х гадовага спыненьня будовы новых крэйсэраў, але з гэтым праэктам не згадзілася Амэрыка. У выніку

**Японія больш схілілася на бок Англіі,**
гэтым яшчэ больш нарушаючы ваенна-палітычную раўнавагу, асабліва на Д. Усходзе, дзе яна больш усяго хістаецца. І толькі гэты апошні факт прымусіў Амэрыку крыху затушаваць правал жэнэўскай конфэрэнцыі, які вельмі выпукляў англійска-амэрыканскія разнагалосьсі, пачаўшыяся з мірнай конфэрэнцыі ў Вэрсалі, байкатаваньня Амэрыкаю Лігі Народаў і дасягнуўшыя свайго апагэю цяпер у зьвязку з нафтавым канфліктам між амэрыканскімі і англійска-галяндзкімі нафтавымі трэстамі. Зусім зразумела, што гэтыя разнагласьсі між дзьвюмя найвялікшымі, наймацнейшымі і найбагацейшымі сьвятовымі дзяржавамі рупліва стараюцца яшчэ больш паглыбіць Нямеччына і Радавая Расея, каб скарыстаць у мэтах асабістых выгад і падмінаваньня агульнага міру. Нямецкія мілітарысты пад гэты шум, выразна імкнуцца да павялічэньня сваёй арміі і падняцьця баявой гатоўнасьці нацыі. Але аб гэтым пагутарым у наступны раз. А бальшавікам вельмі на руку прыйшоўся выпадак з анархістамі Сакко і Ванцэтті, які яны хочуць выкарыстаць для ўзбуджэньня працоўных масаў усяго сьвету проці „буржуазнага клясовага суда".

**Вось ужо трэці тыдзень апінія усяго сьвету зацікаўлена справаю Сакко і Ванцэтті,**
засуджаных амэрыканскім судом прысяжных засядацеляў на сьмерць. Дзеля гэтага неабходна застанавіцца больш падрабязгова над гэтым фактам, каб разабрацца ў шуме, паднятым вокала гэтай справы.

15 травеня 1920 г. у месьце Дэдхаме, Штата Масачузэтс быў абрабаваны на 15,000 даляраў і затым замардаваны касір. У гэтым праступленьні былі абвінавачаны два анархістыя па пераконаньню і італьянцы па паходжаньню Сакко і Ванцэтті. Суд прысяжных засядацеляў засудзіў іх на сьмерць. І калі-б ў той час гэты асуд быў выкананы, дык на гэтым бы усё і скончылася, бо бандытызм у Амэрыцы вельмі распаўсюджаны і суд адносіцца да бандытаў бяз ўсякай літасьці. Але прыхільнікі асуджаных вельмі энэргічна заступіліся за іх і ім удалося ўстрымаць выпаўненьне прысуду і прымусіць суд пераглядзець справу з таго поваду, што быццам была дапушчана судзебная абмылка і што асуджаныя нявіноўны. І перагляд гэтай справы

**цягнуўся ажно 7 гадоў, у працягу якіх Сако і Ванцэтті чакалі сьмяротнай казьні.**

А цяпер вышэйшы суд, у якім між іншым засядаў і судзьля Тэйэр, вынясшы асуд у папярэднім судзе, бо за гэты час атрымаў павышэньні па службе, зацьвердзіў рашэньне папярэдняга суда, а губэрнатар штату Фулер адхіліў прозьбу абароны аб памілаваньні асуджаных і зацьвердзіў прысуд, які і павінен быў быць выпаўнены 22 жніўня.

Вось простая гісторыя фактычнага боку справы Сако і Ванцэтті, узбударажыўшай увесь сьвет. Запраўды, разглядаючы гэтую справу з пункту гледжаньня маралі, ня можна ня прызнаць жорсткасьці амэрыканскага суда, выразіўшайся у тым, што пасьля 7 гадовага чаканьня сьмерці абвінавачаных не памілавалі хаця бы дзеля таго, што яны ў сто, тысячу разоў працярпелі больш цяжкія маральныя мучэньні, чым сама фізычная казьнь, якая кладзе толькі канец маральным страданьням. І ні было-б нічога дзіўнага ў абурэньні ўсяго сьвету гэтаю акрутнасьцю амэрыканскага суда, калі-б гэта абурэньне не саправаждалася ня менш акрутнымі актамі і не насіла спэцыфічнага характару. Адразу, як па камандзе, пачаліся ў паўночнай і палуднёвай Амэрыцы і нават у Эўропе бомбавыя замахі, пацягнуўшыя зусім нявінныя ахвяры ў людзях. Пачаліся агульныя забастоўкі, усялякія эксцэсы і г. д. І проці каго? Гэта-ж судз ў іх не які-небудзь „рэўваентрыбунал", ці „суд чэкістаў", а суд прысяжных засядацеляў, выбраных бяз усякага ўціску свабоднымі грамадзянамі. Чымжа вінны ахвяры бомбавых замахаў ў Буэнос-Айрэсе, ў Філадэльфійскай царкве, ці ў Нью-Іорскай і Лонданскіх падземных жал. дарогах, што дэдахамскі суд прысяжных знайшоў замахаўцаў віноўнымі, а вышэйшы суд і губэрнатар, не пужаючыся ніякіх вонкавых пагрозаў, не асьмеліліся падарваць аўтарытэт народнага суда.

На гэтым тле асабліва яскрава абрысоўваюцца зусім адваротныя, індэфэрэнтныя, нячулыя адносіны гэтай самай „сьвятовай апініі" да ахвяраў іншага суда,

**„бальшавіцка-пралетарскага".**

І што заслугуе на асаблівую ўвагу — гэта тое, што дзірыжорамі ў гэтым „абурэньні сьвятовай апініі" зьяўляюцца ласьне бальшавікі, якія бяз усякага суду і без усякай віны растрэліваюць, вешаюць, топяць, мардуюць сотні тысячаў расейскага народу. І ня толькі сьвятовы пралетарыят, нават „буржуазія" не абураецца і не пратэстуе. Сакко і Ванцэтті так ці інакш былі замешаны ў праступленьне, якое законамі ўсіх дзяржаваў караецца сьмерцьцю. Затым па сваім анархістычным пераконаньням, падрываючым істнуючы дзяржаўны строй, яны ня могуць рахаваць на літасьць, у той час, як у стране „пралетарскага суда" мардуюцца бяз суда заложнікі ці проста прадстаўнікі быўшых буржуазна-інтэлігэнцкіх клясаў. І буржуазія не пратэстуе і не арганізуе бомбавых замахаў на бальшавіцкіх прадстаўнікоў. Сваім умяшацельствам у гэты шум бальшавікі толькі абязвартасьцілі гэта „абурэньне сьвятовай апініі" і зусім магчыма, што можа і зашкодзілі справе Сако і Ванцэтті. А з другога боку напомнілі сьвятовай „буржуазіі" аб яе віноўнасьці і адказнасьці за мільёны нявінных ахвяраў „пралетарскага правасудзьдзя", якое праціваўстаўляецца маскоўскімі катамі „буржуазнаму", караючаму толькі запраўдных праступнікаў за пэўныя праступленьні. А судзебныя абмылкі могуць быць усюды і заўсёды. Трэба толькі аддаць належачае стойкасьці амэрыканскай нацыі, якая між іншым выяўнілася і ў адносінах да бальшавікоў. Толькі, можа быць, дзякуючы гэтаму бальшавіцкая зараза ня можа ў Амэрыцы прышчапіцца. Больш-бы было на сьвеце такіх буржуазных судзьдзяў, як Тэйер і гэткіх губэрнатараў, як Фулер, дык можа быць даўно ня было-бы на сьвеце бальшавіцкага бруду.

N.

## МЕНСКІЯ БАЛЬШАВІКІ НЕЗАДАВОЛЯНЫ...

Выходзячы ў Менску орган камуністычнай партыі Беларусі „Звезда" вельмі незадаволены створаным у Вільні Бел. Камітэтам па справам Самаўрадаў". „Каму патрэбны парады Паўлюкевіча?" — піша „Звезда"... І далей бальшавіцкая газэта тлумачыць па своему заданьне „Бел. Камітэту па справам Самаўрадаў".

Вось-жа не дае спакою Паўлюкевіч з сваімі арганізацыямі няпрошаным менскім апякунам над Заходняю Беларусьсю! Сеў ім, як косьць у горле. Аднак-жа патрэбны ці не патрэбны парады Бел. Камітэту па справам Самаўрадаў, у гэтым разьбяруцца самі беларусы бяз няпрошанага падказу з Менска, якога, на шчасьцьце, ніхто тут не патрабуе.

## Ад Цэнтр. Выб. К-ту.

### Першыя беларускія войты.

*(Працяг).*

**Івенецкая гміна.**

Заступнікам войта выбраны гр. Точка — са сьпіску Нацыянальнага.

**Ваўкавыскі павет — Сьвіслацкая гміна.**

Выбары адбыліся 31 ліпея. Выбаршчыкаў было выбрана 138 асоб, а на выбары зьявілася 131.

Выбрана 14 радных
з іх: беларусаў — 10.
палякаў — 4.

Беларусы ў старай Радзе мелі толькі 2 мандаты, а цяпер у 5 разоў больш.

**Валожынскі павет — Утранская гміна.**

Выбрана радных 10.
з іх: беларусаў умярк. — 6.
палякаў абшар. — 3.
жыдоў . . . . . . — 1.

# Барацьба за беларускіх войтау.

Першая перамога беларусаў на самаўрадавым грунце страшэнна раздражніла шовіністаў і беларусфобцаў усіх масьцеў. Асабліва былі абураны тыя абшарнікі — шовіністы, якія прызвычаіліся лічыць гміны за свой фальварак, а войтаў - за сваіх служакі абаронцаў іх абшарніцкіх інтэрэсаў у гміне на шкоду сялянскім інтэрэсам. Гэткім чынам клясовая і нацыянальная ненавісьць, якую сучасны ўрад стараецца злагодзіць праз новых адміністратараў у нейкіх мейсцах пасьля выбараў у самаўрада наадварот, — яшчэ больш завастрылася. Гэтак здарылася ў гміне Палачанскай, дзе група на чале з буйным абшарнікам Пуцятай і ягоным служкай, гмінным пісарам распачала акцыю проціў першых беларускіх выбранцаў: войта Пятровіча і радных Сенько і Дзеніса.

Калі ўсе высілкі, усе стараньня гэтай групы аб тым, каб п. Пятровіча не зацьвердзілі на войта — разьбіліся і п. Пятровіч быў зацьверджаны новым старастай п. Пекутоўскім, а потым і п. ваяводай, дык гэтая група распачала сваю акцыю проціў новага войта ўжо на свой страх і рызыку, паводле прынцыпу: „улада на мейсцох“. Пачалася гэтая акцыя гэтак:

На першым паседжаньні Рады пасьля рожных справаў *у канцы паседжаньня* адбываліся выбары сябраў да павятовага соймiку. Прысутны быў кіраўнік самаўрадавага аддзелу староства п. Вайчуналіс. Былі пададзены прозьвішчы кандыдатаў да соймiку. Група Пуцяты выставіла п. Пуцяту (які быў перад гэтым у соймiку) і п. Паўловіча, група сялян выставіла сялян — інструктараў „Бел. Нац. Выб. Камітэту“ Сенько і Дзеніса. *Ніхто*, аў тым ліку і прадстаўнік староства кандыдатураў сялян *ня квэсьцянаваў*. Адбыліся выбары і выбарнымі аказаліся п.п. Сенько і Дзеніс.

*Тады (пасьля выбараў!)* раптам п. Пуцята заяўляе, што п.п. Сенько і Дзеніс ня могуць быць выбранымі ў Соймік, бо яны ня маюць абыватэльства!... Трэба тутака зазначыць, што дзяды і прадзяды аднаго і другога з прадвеку жывуць у гм. Палачанскай, а п. Сенько у працягу *6 гадоў* (!) *быў без перарыву радным у гміне!* Аднак-жа прысутны прадстаўнік староства п. Вайчуналіс ня толькі не знайшоў патрэбным высьвятліць зарваўшамуся п. Пуцяце ўсю недарэчнасьць яго заявы, але сьцьвердзіў слушнасьць яе. Тады войт п. Пятровіч запратэставаў і прасіў высьвятліць, на якой падставе выбраных радных, якія зацьверджаны вышэйшай уладай, хочуць выкінуць. На гэта сэкрэтар Міньковскі прынёс нейкую „абыватэльскую“ кнігу, дзе п.п. Сенько і Дзеніс былі запісаны у III рубрыцы г. з. асобаў, абыватэльства якіх пад знакам запытаньня. Але войт Пятровіч замеціў у гэтай-жа III рубрыцы і сваё прозьвішча і запытаў у п. Вайчуналіса: „г. з. і я не магу быць войтам, бо я так сама знаходжуся у трэцяй рубрыцы?...“ Адтрымаўшы адказ: „Так“, войт Пятровіч зьдэнэрваваны зьняў з сябе войтоўскі ланцуг і палажыў яго на стол, бо пасьля афіцыяльнай заявы прадстаўніка ўлады лічыў, што яго войтаўства ўжо скончылася. Паўстаў папалох. Усе радныя беларусы, абураныя паўскаківалі з мейсцаў. Бачучы, што хвацілі за край, сэкрэтар нейдзе знайшоў, што Пятровіча нехта перанёс да II рубрыкі і значыць ён можа быць войтам!..

Тады п. Пятровіч зноў налажыў на сябе ланцуг. Але тутака зноў запратэставаў п. Пуцята, заявіўшы, што войт тым, што зьняў ланцух, зьняважыў дзяржаўную годлу (гэрб) і заявіў, што ён у знак пратэсту складае з сябе мандат раднага, а факт зьняцьця з сябе подчас паседжаньня войтаўскага ланцуга патрэбаваў занясьці да пратаколу, што і было зроблена.

Праз дзень войт Пятровіч адтрымаў паперку ад старосты, што ён звольнены з пасады войта. А ў вечары ён ужо быў заарыштаваны і пасаджаны ў вастрог ў Вілейцы!..

І можа доўга прышлося бы выбранцу народа пакутаваць у турме, каб не Бел. Нац. Рада!

Бел. Нац. Рада ня толькі палажыла працу разам з Бел. Нац. Выб. Камітэтам, каб правясьці першых нашых беларускіх войтаў. Яна найшла адвагі і ўменьня дастаць з турмы тых сваіх сябраў, якія ідуць у абароне свайго народу. 9-га жніўня быў заарыштаваны Пятровіч, а 11-га Старшыня Рады, разам з прадстаўніком Рады на Віленшчыну п. Берніковскім, пасьля інтэрвэнцыяў і клопатаў перад уладамі і пракурорам, выцягнулі з турмы п. Пятровіча. Справа аб нібы та сьвядомай абразе п. Пятровічам дзяржаўнага гэрбу скіравана да пракурора і мы пэўны, што пракурорская ўлада, дапрасіўшы ўсіх сьведкаў, вастановіць праўду, якую надужылі людзі, засьляпёныя клясовай ненавісьцю і шовінізмам да беларускага сялянства і не здужалі абараніць пэўныя недарэчныя ўрадоўцы староств, ў якіх новы староста не пасьпеў яшчэ прышчапіць новы толеранцыйны дух Аднаго сяла ў гэтай справе Бел. Нац. Радай зложаны апрача асабістай заявы п. старшыні, — абшырны мэморыял п. ваяводзе Да заканчэньня справы п. Пятровіча ў судовых уладах мы устрымаемся ад далейшых вывадаў, але ўжо цяпер *усе* беларускія новыя самаўрадавыя працаўнікі павінны зразумець, што *нашая беларуская сіла, наш ратунак і адзіны шлях да* абароны інтэрэсаў сялянства раднымі, якіх паслаў народ — ёсьць *арганізаванасьць* беларускіх радных з адзіным сваім нацыянальным цэнтрам — Бел. Нац. Радай і „Бел. камітэтам па самаўрадавым справам“.

# Сьвятовы Сабор хрысьцьянскіх Цэркваў у Лазане.

У Лазане (Швэйцарыя) адкрыўся ўсесьвятовы сабор хрысьцьянскіх цэркваў за вынняткам рымска-каталіцкай. Першы таўчок гэтаму сабору даў міжнарадовы зьезд місіянэраў Старага і Новага Сьвету, адбыўшыся ў 1910 г у Эдзінбурзе. На гэтым зьездзе выясьнілася, што галоўнаю перашкодаю ў распаўсюджаньні хрысьціянства сярод паганцаў зьяўляецца ня столькі коснасьць абарачываемых у хрысьцьянства паганцаў, колькі розьнь і саперніцтва місыянэраў. Зьезд выразіў жаданьне, каб былі усунуты перашкоды, дзелячыя хрысьцьянскія цэркві. У тым-жа 1910 г. думка аб адзінай Хрыстовай царкве перакінулася ў Поўночную Амэрыку. У Цынцыпаціі на саборы Амэрыканскай епіскапскай царквы епіскап Брэнт, адкрыўшы Лазанскі сабор, правёў наступную пастанову:

„Мы думаем, што прыйшоў час сабраць у адно ўсе галіны Хрыстовай сямьі, каб абгаварыць пытаньні аб веры і царкоўнай арганізацыі. Мы хочам аб'яднацца з нашымі братамі па веры, каб знайсьці ня толькі тое, што патрэбна нам самім, але і тое, што патрэбна другім, бо мы пераканаваны, што дасягнем поўнай згоды між сабою толькі ў тым выпадку, калі будзем кіравацца духам любві і братцва. Мы пераконачы, што конфэрэнцыя, скліканая для абгаварываньня бяз права прыймаць якія небудзь акалчальныя пастановы, будзе першым крокам на шляху да ўсесьвятовага аб'еднаньня“.

Выбраная тады-ж камісія занялася падрыхтоўкаю грунту для накрэсьлянага Сабору і з 1910 на 1920 г. было разослана па ўсяму сьвету каля $1^1/_2$ мільёна кніжак, знаёмячых шырокія колы хрысьцьянства з гэтымі пачытаньнямі У 1919 г. асобая дэлегацыя ў складзе 5 сябраў адправілася ў Стары Сьвет і наведала Афіны, Сьмірну, Канстантынопаль, Сафію, Бухарэст, Белград, Рым, Аляксандрыю, Каір, Ерусалім, Дамаск, Парыж, Лёндан, Нарвэгію і Швэцыю. У Рыме гэта дэлегацыя была прынята папам, які, як і трэба было чакаць, адказаў, што „адзіная сусьветная царква ўжо істнуе, што ёю зьяўляецца рымска-каталіцкая, якая можа прыняць у свае лона ўсіх хрысьцьян сьвету, але якая ня можа уваходзіць у склад якога-небудзь шага хрысьцьянскага аб'еднаньня.

У 1920 г. прадстаўнікі 78 цэркваў з 40 дзяржаваў зьехаліся ў Жэнэве і падкрэсьлілі тыя пытаньні, якія належыла разглядзець на будучым Саборы. Гэта конфэрэнцыя ў сваю чаргу выдзяліла камітэт, які пастанавіў у 1925 г. у Стакгольме склікаць усесьвятовы Сабор у жніўню 1927 г. у Лазане

На Сабор у Лазане зьехаліся прадстаўнікі усіх цэркваў, апрача рымска-каталіцкай, з усіх часткаў сьвету. Тут ёсьць прадстаўнікі і англіканскай епіскапальнай царквы, ад якой выйшла ініцыятыва скліканьня ўсесьвятовага Сабору, і мэтадыстаў, і баптыстаў і лютэран, евангэлістаў, японскай „Ніпан Сэн-Коквай“. Епіскап бамбэйскі з Індыі ў белай расе гутарыць з архіепіскапам Упсальскім Натанам Сэдэрблюмам, епіскап—нэгр размаўляе з сьвяшчэнікам кітайцам. Душою Сабора зьяўляецца епіскап Заходняга Нью-Іорку Брэнт. грошы ахфяравалі на гэтую добрую рэч Марыан (100,000 даляраў) і Рокфэльлер (50,000 дал.) Уся арганізацыя амэрыканская, мова—амэрыканская, тэкст большасьці раздаваемых брашураў — дакладаў - амэрыканскі. Як відаць адсюль, матэрыяльны дабрабыт не забіў веры ў амэрыканцах.

Епіскап Брэнт у сваей прамове ўказаў, што ў некатарых невялікіх местах маецца шмат рожных цэркваў, якія ледзь істнуюць дзякуючы таму, што належаць да рожных водценяў аднэй агульнай Хрысьцьянскай веры. Ад гэтага церпяць і царква, і вера, і самі веруючыя.

Другі кірунак, намеціўшыйся ў часе апошніх 10-ці гадоў, — гэта імкненьне Англіканскай епіскапальнай царквы да зблежэньня з Усходняю Праваслаўнаю Дзеля гэтага праваслаўныя ерархі займаюць на Саборы самае паважанае мейсца. Ад праваслаўнай Царквы прыбылі на Сабор мітрапаліт Еўлогі (расейскай эміграцыі) Дыавісый (Польская Царква), сьвяшчэнікі Булгакоў і Туркевіч, праф. Арсеньеў і Глыбакоўскі Ад Баўгарыі – сафійскі мітрапаліт Стэфан, той, які чытаў Евангеліе ў Саборы ў момэнт узрыву. Найбольш прадстаўнікоў ад Грэчаскай Царквы — дзясяць. Сярод іх мітрапаліт Гэрманас, прадстаўнік усесьвятовага патрыяршаства і два епіскапы. Грэкам прыпісваюць дыплёматычную ролю — ня толькі зблежэньня з англійскаю Царквою, але і узмацненьне гэткім шляхам ангійскага ўплыву на Балканах. Уся праваслаўная група трымаецца цесна і дружна. Гэта адзінства і той арэол, якім акружана цяпер, прайшоўшая праз цяжкую пробу, Праваслаўная Царква, прыцягвае да сябе сымпатыі ўсіх прысутных

Настрой Сабору больш філясофскі, чым рэлігійны. Сабор працягнецца каля 17 дзён.

## Разпаусюджвайце сваю газэту.

У Г. П. У. (Чэка).



— Ваш растрэл адложаны да заўтра; сяньня мы ўсе заняты ў дэманстрацыі проці сьмяротнай казьні ў Амэрыцы.

# Няудалая спроба правакацыі.

„Наша Праўда“ ў № 36 перадрукоўвае з „Голасу Беларуса“, які выходзіць у Рызе, заяву нейкага *Ігната Граба з Варшавы* (?!) У гэтай заяве можна прачытаць між іншым наступнае:

„З гэтае кампаніі і выйшаў забойца Барыс Кавэрда, якога *мы* бачылі заходзячым да пана Сухэнка 24-га, 27 і 31 траўня ды 2-га чэрвеня. А і доктар Паўлюкевіч чамусьці „обдзелываў“ свае справы разам з Кавэрдай ў Варшаве, якраз перад забойствам. Хоць мусім тутака крыху бараніць яго! Ён *сам гаварыў* (курсіў нашы. Рэд.), што прыехаў наладзіць справы свае, падкапаныя „тайным мэморыялам“ пасла Ярэміча. Далей, ужо ад сябе, „Наша Справа“ спадзяецца, што „польскі ўрад дасьць вычэрпываючае запярэчаньне“...

Што датычыць самай зацемкі, дык яна ёсьць на гэтульки дрэна зробленай правакацыяй, што аб ей нават і гаварыць ня варта. Што зьменавехаўскі, выходзячы на бальшавіцкія грошы, „Голас Беларуса“ мог дапусьціць гэткую глупоту, каб цьвердзіць аб прысутнасьці п. Паўлюкевіча ў Варшаве разам з Кавэрдай перад забойствам, —гэта зьявішча магчымае бо „Голас Беларуса“ праверыць свайго *„варшаўскага* беларуса“ Ігната Граба ня можа. А вось „Н. Справе“ дакладна вядома, што п. Паўлюкевіч *нікуды* ў гэтых датах ня выяжджаў, бо акурат адбывалася партыйная конфэрэнцыя (22 траўня!) і пасьля конгрэгаваліся матэр'ялы конфэрэнцыі. А ў Варшаву п. Паўлюкевіч ня езьдзіў зусім ажно з зімы і да момэнту, пакуль яго ня выззвалі ў суд. Што датычыць таго, што п. Паўлюкевіч *адчыняў* сваю душу нейкім „варшаўскім Грабам і К-о, дык думаем,—гэткай непрахадзімай прастаце і глупоце п. Паўлюкевіча сама „Н. Справа“ ня верыць Жаданьне „Н. Праўдай“ ад ураду запярэчаньня лічым з яе боку на гэтульки наіўным, як і нахальным.

# Апошнія навіны.

## З Польшчы.

### ЗЬНІКНЕНЬНЕ ГЭН. ЗАГУРСКАГА.

Гэн. Загурскі пасьля звальненьня з Антокальскай турмы ў Вільні тойчас выехаў да Варшавы, дзе мусіў зьявіцца Маршалку Пілсудзкаму з дакладам Па дарозе ён папрасіўся ў саправажджаўшага афіцэра зайсьці ў лазьню памыцца на што адтрымаў дазвол. Як зайшоў, дык і згінуў. Думаюць, што ён выехаў за граніцу праз Гданск. Да гэтай пары німа віякіх чутак і сьлядоў аб мейсцу яго пабыту.

### АХВЯРЫ ДЛЯ БАР. КАВЭРДЫ.

У рэдакцыю газ. „Возрожденіе“, выходзячай ў Парыжу, паступіла да 12 жніўня ахвяраў для Барыса Кавэрды 27,697 францускіх франкаў.

## З Заграніцы.

### ЧАРГОВАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ Ў ПАРТУГАЛІІ.

У Партугаліі амаль што кожны сэзон года выбухае ваенная рэвалюцыя. І цяпер па жаданьню афіцэраў — манархістаў Лісабонскага гарнізону прэзыдэнт рэспублікі і кабінэт вышлі ў дымісыю.

### АНГЛІЯ РЫХТУЕЦЦА ДА ВАЙНЫ З С. С. Р. Р.

Лёнданскі кар. „Tribune“ і „Wash Post“ паведамляе, што Англія пасьпешна рыхтуецца да будучай вайны з Расеяй. Гэнэральны штаб абрабіў вялізарны плян кампаніі, паводле якога галоўная маса англійскай арміі будзе сабрана ў Індыі. Гэта армія падлягае не індыйскаму віцэ-каралю, а ваеннаму міністэрству. Ваенны міністар ужо адправіўся ў Індыю для перагавораў з віцэ-каралём.

ЗОШЧЭНКА.

# Сацыяльны сум.

*(З расейскіх савецкіх апавяданьняў.)*

Даўно ўжо я, браткі, зьбіраўся расказаць аб камсамольцу Грышцы Сьцяпанчыкаве, ды ўсё нек забываўся. А час канешна йшоў. Можа поўгода прайшло з тэй пары, як з Грышкай здарылася гэтая сабачча няпрыемнасьць.

Канешна хлапец быў абвінавачаны ў шкадлівым напрамку: мяшчанскія настроі і наагул падрыў сацыялізму. Аднак-жа дазвольце ўсебакова асьвяціць гэтую вельміпаважаную гісторыю.

Здарылося гэта, канешна, ў Маскве. А можа і не ў Маскве. Але здаецца, што ў Маскве. Па размаху відаць. Аднак-жа сьцісла не бярэмся сьцьвярджаць.

„Чырвоная газэта“ падрабязна не напісала, а толькі поўпэцітам адцеміла: быў у Сямёнаўскай ячэйцы.

А было гэта так. У Сямёнаўскай знацца ячэйцы лічыўся гэты самы многапакутны Грышка Сьцяпанчыкаў. І адновячы нек выбілі гэтаму Грышцы тры зубы. З якой прычыны выбілі ізноў нам няма ведама. Можа лішкі фізкультуры. А можа аб дзерэва стукнуўся. А то можа ў дзіцячым веку салодкага за шмат еў дык і высыпаліся. Адно ведаем,—што зубы яму выцягнулі не пьянай лавачцы. Гэтага ня можа быць.

Дык вось жыве гэты самы Грышка бяз трох зубоў. Іншыя ўсе на сваім месцы. А гэтых, як на грэх, няма.

А хлапец малады. Усебаковы Не цікава яму, ведаеце, быць бяз трох зубоў. І якое жыцьцё з гэткім бракам? Сьвістаць – нельга. Жраць – кепска І папяроску трымаць няма чым. Ізноў жа шыціць пры гутарцы. І гарбата ліецца

Хлапец ужо і так і гэтак і воскам заляпляў і пекляваным хлебам закладваў дзюру — не выходзе. Зьбіў нек Грышка грошаў. Пайшоў да доктара.

— Устаўце, кажа, калі на тое пайшло тры штучных зубы.

А доктар трапіўся малады, але асьцярожны. Ня ўнікнуў ён у псыхалёгію Сямёнаўскай ячэйкі. Доктар гэты ўзяў ды і ўставіў Грышцы тры залатыя зубы.

Сапраўды – няма чаго казаць — багата вышла. Адчыніць вусны — абразок! Не наглядзішся! Накцюрн!

Сталі ў ячэйцы на Грышку каса паглядваць. Знацца, як расчыніць губы чалавек— кажа што альбо есьць, — дык усе глядзяць. Моў: у чым справа? Чаму гэта хлапец так анранаецца?

Пайшлі дробныя гутаркі вокал выпадку. Адкуль знацца—гэткія нэпманаўскія ўхваткі?

Нашто гэткі мяшчанскі настрой?

Няўжо-ж простаму камсамольцу нельга дзюркай грызьці ці есьці?

І на чарговым паседжаньні ўзнялі пытаньне: ці нешта падобнае можа быць дапушчана? І наагул пастанавілі: „прызнаць уладаньне залатымі зубамі за з'явішча, якое вядзе да адмовы ад сацыялізму і яго ідэяў, і мы сябры В.Л.К.С.М. Сямёнаўскай ячэйкі аб'яўляем проці іхніх насіцеляў барацьбу, як з з'явішчам, якое разбурае камсамольскія ідэі Зубы—аддаць у фонд безработных. Інача—будзе пастаўлена пытаньне аб выключэньні з шэрэгаў саюзу.

Тут старшыня ад сябе яшчэ падбавіў пару. Ведама-ж мужчына, каторы гарачы-ня вытрыманы. Наказаў шмат горкіх словаў.

—Я, кажа, дарма што старшыня, а і то кажа, не замахваюся на залатыя цацкі. А мяне, кажа, даўно заместа задніх зубоў адны карэньні тырчаць. І нічога: грызу. А як грызу, – адзін бог ведае. Мо' пальцамі памагаю, знацца, грызьці. Але не замахваюся.

Усхліпнуў, канешна, Грышка Сьцяпанчыкаў. Сумна яму зрабілася гэткія зубы аддаваць у фонд безработных. Пачаў тлумачыцца: не, моў прылютаваны, цяжка выбіваць.

Ды і не аддаў.

Папёрлі яго з саюзу ці-не, ня ведаем. Ня маем па гэтай справе больш інфармацыяў. Але напэўна папёрлі.

А кажуць у Троцкага — аж 7 залатых зубоў ды адна сярэбраная пломба. І чаму гэтага ня бачыць Сямёнаўская ячэйка?.

М. ЗОШЧЭНКА.

# АМАТАР.

*(З савецкай гумарыстыкі.)*

Асабіста я, браткі маі, да дахтароў іду вельмі рэдка. Гэта знача ў асаблівых выняткава, неабходных выпадках. Напрыклад зваротны тыфус, альбо з драбіны шлёпнуўся. Тады праўда, зварочваюся за мэдыцынскай дапамогай. А так я не аматар лячыцца. Лічу, што сама

# Раяшнік.

(Жыцьцё нацыянальнае і сцэнкі правінцыяльныя)

Вось вам і войт палачанскі, беларус наш сялянскі. Нядаўна выбраны і ўжо заарыштаваны.,.

Лоўка?!.. Ні капусты галоўка! Ні качан — гэты войт з Палачан! А веларус полёнафільны, да Польшчы прыхільны. Ні камуністы, ні „Грамадзісты"!

За тое і выбраў народ, што ён не цягнуў на Усход.

А тутака на — тка?! Што за загадка?!

Не дарма ўсё казалі: Пуцята, Мінькоўскі, а на'т Кананові́ч, што ня быць табе войтам Пятровіч!

І каб ня інтэрвэнцыі нашыя, ці, як кажуць, інтэрпэляцыі,—ня хутка спаткалі-б цябе ўжо прыяцелі..

Але не абурайся Народзе, бо Пятровіч ўжо на свабодзе, і выйшаў хоць ён і з „кутузкі", ня хвалячы лёс беларускі, але тым ужо ёсьць задаволены, што праз нашую Раду быў звольнены..,

Ня лезьце-ж у войты праўныя, беларусы права слаўныя!

ВосьШыманьскі, панок, што із Лодзі?! Дык гэта ўжо годзі!

Няхай не спадзеваецца, што на войта дачакаецца.

А Міньkоўскі, што ўеўся народу да косьці;— ня ведамы хіба пану Старосьце і для агульнае справы дабра — яго звольніць даўно ўжо пара, бо ў гміне ён гэтак працуе, што улады свае дыскрэдытуе.

Памажы-ж нам Божа, калі кум Сьвентаржэцкі яму дапаможа?!

Цяпер паглядзіце яшчэ на фігуру, якая ці з „б'зіку", ці з дуру, а можа пад пьяны настрой..

Стой, братачкі. стой?!..

Гэта-ж Мам нька?!— Э эр наш прыяцель — аматар бязплатных „каляцый"...

Гэта ж сам ён, ці з Прагай у згодзе, заўсёды нос круце па модзе.

І цяпер пратэстуе ў справе Сакко і Ванцэтті, каб ведалі, што жыве шчэ Мамонька на сьвеце.

А як партыю створа ў першы гатунак — усім, усім будзе тады ўжо ратунак.

Але вось, што тут дзіва, што сьцьвердзіць я мушу праўдзіва—ў рыфмах, а н'ат і пад прозы, што пратэст пісаў ён цьвярозы.

Гэта-ж ня жарты?!.. Дык усім на пацеху меняй брат Мамонька, хутчэй сваю „веху".

А ці будзе пасьля ў нас дзюра?! Валяй брат Мамонька!—ўсе пракрычым мы ўра!.

А вось у Менску, дык не задаволены, што „камітэт да радных" у нас створаны.

Баяцца, каб ад народу, ня ўхілілі мы ўплывы з усходу. Маюць рацыю —на гэтаю камбінацыю.

О! Бальшавікі ня дурні і не цяляты, дык сьцеражыцеся, хто мае ўласныя хаты.

*Шэйнэ-Катарынка.*

## ЗАМАХ У РАДАВЫМ КОНСУЛЬСТВЕ Ў ПАРЫЖУ.

У савецкае консульства ў Парыжу зайшла нейкая Анна Шчэпкіна з дзіцянём на руках, аказаўшаяся расейскаю бежанкаю, і выстрэліла з рэвальверу ў першага, вышаўшага на спатканьне, служачага Фаміна, трапіўшы куляю ў галаву. Шчэпкіна арыштавана.

## ПАЎСТАНЬНЕ ІНДЭЙЦАЎ У БАЛІВІІ І ЧЫЛІ.

У Баліві (Палуднёвая Амэрыка) выбухла паўстаньне туземных індэйцаў у ліку каля 80,000 чалавек. Паўстанцы мардуюць усіх эўрапэйцаў, паляць фэрмы і нішчаць усё. Дзяржаўныя вайскі прычыняюць ім вялікі ўрон, бо індэйцы вазружаны лукамі. Паўстаньне перакінулася і на суседнюю рэспубліку Чылі.

## ВЫШЭЙШЫ ТРЫБУНАЛ ВЫСЛУХАЎ АБАРОНУ САККО І ВАНЦЭТТІ.

Вышэйшы трыбунал у Бастоне сабраўся 16 жніўня на сэсію і выслухаў абаронцаў Сакко і Ванцэтті, якія даводзілі пярэчнасьць між актам абвінавачаньня і папярэднім судзебным разборам і жадалі новага перагляду справы.

## АДКЛАД КАЗЬНІ САККО і ВАНЦЭТТІ.

Казьнь Сако і Ванцэтті вызначаная на 11 жніўня зноў адложана да 22 жніўня.

## ЧАНГ-ТСА-ЛІН Б'Е ШЭКА.

Памыснае наступленьне нанкінскага дыктатара Шэка на Пэкін зьмянілася памысным контр-наступленьнем Чанг-Тса-Ліна, арміі якога пагражаюць нават Шанхаю. Аднасясна ў Ханькоў прадаўжаецца прасьледаваньне камуністаў. У Кіў-Кіанг арыштавана 50 камуністаў, з якіх 26 ужо растрэляны.

## Наступленьне арміі Чанг-Тса-Ліна.

Паўночная армія Чанг-Тса-Ліна шпарка наступае на Нанкін. За Шанхаю сьцякаюцца масамі бежанцы. Паўночная армія заняла ўжо Пукоў, адкуль абстрэліваецца Нанкін. Англічане эвакуіруюцца на ваенныя суды.

САККО і ВАНЦЭТТІ.

Увесь сьвет абурыўся на жорсткасьць амэрыканскага суда, асудзіўшага на сьмерць двох італьянскіх анархістаў-замахоўцаў і ня выканаўшага гэтага асуда ў працягу сямі гадоў.

## НЯЎДАЛАЯ СПРОБА ПЕРАЛЕТУ З ЭЎРОПЫ ДА АМЭРЫКІ.

Пасьля няўдалай спробы пералёту праз Атлянтыцкі акіян францускіх лётнікаў Колі і Нэнжэсэра, згінуўшых дзесь бяз сьледу, больш эўрапэйскія авіятары не рашаліся на гэты рызыкоўны палёт. І толькі пасьля трох шчасьлівых пералётаў амэрыканцаў з Нью Іорку да Францыі і Нямеччыны ў рожных мейсцах Эўропы пачаліся падрыхтоўкі да рэванша. Першымі спрабавалі два нямецкіх лётнікі на аэрапланах сьвятовай фірмы „Юнкерса"— „Эўропе" і „Брэмене". Яны выляцелі з Дэсаў 14 жніўня рана з пасажырамі, але праз некалькі гадзін мусілі вярнуцца назад з поваду густога туману ў паветры і адтрыманых вестак аб буры на атлянтыцкім акіяне. Вага кожнага з аэрапланаў дасягае 3,800 кіляграмаў ці 245 пудоў, з чаго на бэнзын, патрэбны для 50 гадзіннага лёту, прыходзіцца 2,100 кілаграмаў (131 пуд) і масла для смазкі — 81 кіл (п. д.) Гэта такая вага, ня лічачы пасажыраў і іх багажа, а так жа пошты.

# У ЧЫРВОНЫМ ПЕКЛЕ.

## „КАМПРАМІС".

У Маскве адбыўся партыйны суд над апазыцыяй Троцкага і Зіноўява, якіх пастаноўлена было выключыць з партыі. Для зацьверджаньня гэткай пастановы была склікана спэцыяльная сэсія цэнтральнага выканаўчага камітэту і цэнтральнага кантрольнага камітэту камуністычнай партыі. Паседжаньні адбываліся тайна. Дзеля таго, што прадстаўнікі апазыцыі заявілі, што яны адмаўляюцца ад значнай часткі сваіх тэзысаў, пленум пастанавіў не разглядаць пытаньня аб выключэньні Зіноўява і Троцкага з цэнтральнага камітэту і выразіць ім строгі выгавар з перасьцярогаю. Затым пастаноўлена склікаць зьезд партыі на першае сьнежня. Гэткім чынам рашучая барацьба большасьці з апазыцыяй часова закончылася „кампрамісам". Але ці на доўга?

## СТАЛІН РАЗАРУЖАЕ АПАЗЫЦЫЯНЭРАЎ.

З Масквы паведамляюць: Троцкі заявіў сваім прыхільнікам што да пачатку камуністычнага кангрэса 1 сьнежня ён скіне Сталіна. А Сталін з свайго боку выдаў загад аб разаружэньні сябраў апазыцыі, якія павінны зложыць усё аружжа ў Г. П. У.

## САВЕТЫ ЗВОЛЬНІЛІ УКРАІНСКІХ АПАЗЫЦЫЯНЭРАЎ.

Сытуацыя на Украіне на стольки паважная, што радавыя ўлады прымушаны былі звольніць з арышту лідэра Украінскіх апазыцыянэраў бышага камісара асьветы Шумскага. Праз два дні пасьля арышту яго, забаставалі ўсе Харкаўскія фабрыкі. Калі-б ён ня быў звольняны, дык гэтым самым пагражалі і фабрыкі Данецкага басэйну.

## „АГОНЬ ПА ВАРОЖЫМ УПЛЫВАМ".

„Комсомольская Праўда" (№ 17?) піша: „Пазбаўленыя аружжа зарубежнымі ворагамі ажывіў радужнымі надзеямі нашых унутраных клясавых ворагаў. Ясна, што ворагаў мы мелі ў сябе ня мала і раней, але гэтыя ворагі ласьне за апошні час абадрыліся. Пералічым галоўнейшых з іх: 1) Антысэмітызм і шовінізм усялякай масьці. Узрост антысэмітызму бязсумліўны. 2) Сэктанства і уплыў рэлігіі наагул. Духавенства шмат чаму навучылася ў ажыцьцяўленьні свайго уплыву на сялян 3) Мяшчанскі індывідуалізм. Ён расьце і сярод комсамольскіх масаў Гэта галоўнейшыя ворагі. Але імі ня ісчэрпываецца лічба варожых нам уплываў, яны зьяўляюцца толькі найбольш выпукла вырасшымі перад намі"...

## СТУДЭНТЫ ПРОЦІ КОМУНІЗМУ.

З Масквы надходзяць весткі, што у савецкіх сталіцах паміж студэнтамі пачынаецца ўзрастаць барацьба на грунце ідэйным. Студэнты ўсё больш і больш выказваюцца за проці дактрынаў вучэньня камунізму. У студэнцкіх гуртках Петраграда і Харкава, роўна як і ў іншых вялікшых горадох, вучэньне філёзофіі і тэолёгіі захапляе ўсё большыя колы студэнцтва.

## ПОМСТА УКРАІНЦАЎ.

У раёне Жмэрынкі у радавай Украіне нявыкрытыя спраўцы замардавалі 9 жыдоўскіх гандляроў, ехаўшых на кірмаш. Пасьля забойства невядомыя схаваліся, пазаставіўшы запіску, у якой пішуць, што гэта забойства з'яўляецца помстаю за забойства Петлюры. Г. П. У. арыштавала 8 чалавек, западазроных у забойстве, у тым ліку аднаго сьвяшчэніка, які ўжо растрэляны.

## ШКОЛЬНАЯ СЕТКА у С.С.Р.Р.

„У 1926—7 г лічылася 106,729 пачатковых школаў з 9,8 мільёнаў вучняў (на 2% больш школаў, чым у 1914 — 15 г) і 1706 сярэдніх школаў з 564,500 вучняў (на 4.7% менш, чым у 1914—15 г.)". („Праўда" № 178).

## Нагрaда за растрэлы.

Калегія Г. П. У. выдала 172 вышэйшым агэнтам чэкістам С. С. Р. Р. награды ў разьмеры месячнай пэнсыі за „памысную ліквідацыю контр-рэвалюцыйных арганізацыяў заграмічнага шпіянажу".

## ХАЛЕРА Ў УСХ. БЕЛАРУСІ.

На ўсей тэрыторыі Усх. Беларусі шалее эпідэмія халеры. Шмат сьмяротных выпадкаў. У зьвязку з гэтым польская паграмічная варта (К. О. Р.) адтрымала загад строгага кантролю радава-польскай граніцы з мэтаю перашкоды перанясеньню эпідэміі на польскую тэрыторыю.

**Пашырайце роднае слова!**

## Прошаны абед.

(*З баек Крылова.*)

Ня ведаю з якой прычыны
Былі пам які то ці імяніны —
Мядзьведзь абед даваў.
І на абед ня толькі сваякоў мядзьведзяў —
Усіх сваіх су едзяў
Здалёку нават пасправшаў
Аддаць мядзьведзю трэба чэсьць:
Было што й піць і есьць.
Сталы ламілісь аж ад стравы,
Руччом ліліcь гарэлка, піва..
Зусім тады няма тут дзіва,
Што госьці ўміг абселі лавы.
Мядзьведзь як след —
Частуе ўсіх, піць—есьці запрашае
І бачыць з радасьцяй: абед.—
Усім да смаку прыпадае!
Вось каб гасьцей шчэ болей разахвоціць—
Здароўе ўсіх узносіць,
Застольны песьні стаў пяяць,
Пусьціўся урэшце на'т скакаць...
Ліса ў далоні біць пачала:
„Вось танцор! такіх тут мала!
Вось дык Міша! як прыгожа,
Зграбна й лёгка скакаць можа!
Ну шчэ-ж крышку! Уперад! Сьмела!"...
—„Кума мусіць звар'яцела"?
Воўк лісе на вуха шэпча:
—„Дзе тут прыкрасьць? То-ж ён дрэнча
Усё на месцы, дый адно,
Быццам таўчэць талакно!
Харaство знайшла! І ў чым?
Хіба сьмяешся ты над ім"?
„Эх, кумок! ліса ў адказ:
А абед хто даў для нас?
Сама бачу: скача блага,
Аднак мусім быць з увагай.
Бо як дружна, ўсе, як сьлед,
Яго пахвалім за абед —
Ён у пахвальбе як засмакуе —
Яшчэ і вячэрай пачастуе!"

*Б. Друцкі.*

## Падзяка.

„Прыйдзіце пад схоў ціхі радасны мой
вы ўсе, каму жыцьце няміла
хто глыбака церпіць, хто хворы душой,
нядоля каго загубіла.

Усім хворым душою я дам супакой,
бяздольным — надзею на долю,
і усіх я сагрэю любоўю маёй,
і усім дам пацехі даволі".

Сказаў нам калісь гэтак Божаскі Сын,
і словы яго захаваліcь,
і ў цяжкія хвілі ў сэрцы маім
усьцяж яны йзноў нарадзаліcь.

Яны памагалі мне крыж мой нясьці
жыцьця на нярoўнай дарозе,
яны памагалі пацеху знайсьці
мне ў горы, у бядзе, у трывозе.

О, Божа магутны, ты дзякуй прымі
за гэтыя дзіўныя словы
ад грэшнага сына з пакутнай зямлі,
дзе гора знайшло сабе сховы.

ГАЛІНА.

---

прырода найлепей усе органы рэгулюець. Ей лепей відаць.

Канешна я ня іду проці мэдыцыны Гэтая прафэсыя, сказаў-бы так жа неабходна ў агульным мэхавізме дзяржаўнага будаўніцтва. Але асабліва захоплівацца мэдыцынай - зусім ня добра

А цяперака як-раз гэтакіх аматараў многа.

Вось мой сябра Сашка Ягораў. З сім залячыўся. А добры быў чалавек. Разьвіты, полуінтэлігэнтны, ня дурак выпіць. І вось пяты ўжо год лечыцца

А сьпярша нічога такога асаблівага ў яго і ня было. Проста быў худавы суб'ект. Ну, ведама-ж ў часе голадухі жралі кепска, вось і абтрэпаўся чалавек. І пачаў лячыцца.

Пачаў лячыцца і пачаў папраўляцца.

Папраўляецца ды папраўляецца.

І праз два гады яго так расьпёрла, што ўласныя дзеці пачалі пужацца яго таўшчыні і выразу вачэй.

А выраз гэты звычайна быў нейкі перапуджаны. Так студзіўся чалавек, што яго так разнясло. І думаў ужо быў спыніць лячэньне ды бачыць: позна. Трэ ўжо ад таўшчыні ды сала лячыцца

Пачаў лячыцца ад гэтага.

Доктар кажа: — Сала — галоўны повад вашага нявярухлівага жыцьця. Альбо—наадварот. Болей кажа, трэба ўзад—уперад хадзіць, можа ад гэтага сала спадзе

Пачаў сябрук хадзіць. Ходзіць і ходзіць, як такі сякі сын. Цэлы дзень ходзіць а да вечару ў яго разгуляецца гэтакі апэтыт,— што і ўстрымацца ня можа. І такі добры сон зьявіўся — проста беда Адным словам — за кароткі час у чалавека прыбавілась больш пуду вагі. І пачаў важыць ён пудоў дзевяць.

Доктар кажа:

—„Не, кажа, хадзіць вам шкодна. Спыніце. Вам пэўне езьдзіць трэба. З'езьдзіце на курорт".

Цяперака сябра мой зьбяраецца ехаць на курорт. У Эсэнтукі, або Боржом Я ня ведаю. Адным словам чакае, што будзе карысна

Я з свайго боку так-жа лічу, што курорт яму прынясе карысьць. Пастаіць чалавек за білетам на чугунку ночкі дзьве, папшлындаецца за спраўкамі ды за атрыманьнем грошаў, і спусьціц, як піць даць, пудзікаў два, калі ня болей

Ды яно і зразумела. Тут будзе, можна сказаць, бэзпасрэдны чынны ўплыў на чалавечы арганізм.

УЛ. ТАБОЛЯКОЎ.

# МУЗЫКА.

(*З савецкай гумарыстыкі.*)

Гуляньне ў „садзе Працоўных" падыходзіла да канца Дзьве аркестры музыкі па чарзе ігралі розныя музычныя нумары.

Шымон Ператыкін, будучы крыху „на ўзводзе", хадзіў па дарожкам разам з прыяцелям сваім Пётрай і прыслухваючысь да музыкі казаў:

— Ах, Пятрук, як гэтая музыка на мяне ўплывае! Проста душа ідзе! Слухаю яе і чую, вось у гэтых самых грузёх, — што я знацца, вольны грамадзянін!

— Але, пэўне-ж . ясна, музыка, гэта канешна... згадзіўся Пятрук.

— І ўся, знацца, прошласьць адыйшла безпаваротна і ня зьвярнецца ніколі. Асінавы кол на яго магілу! Дык вось расчыні, расчыні вухі! У-ух! як пекна граюць! У бойку, ў самае пекла палезу пад гэтыя гукі... Ура так і хочыцца крыкнуць! Чую нашую музыку! Пайду я, Пётра, пахвалю гэтых музыкантаў, перацалую іхнія паганыя морды... Ф-ф-фу, ажно сьлязу ў мяне выгналі!.

Ператыкін падыйшоў да адпачываючых музыкантаў. Флейцісты праглядвалі ноты, басы абціралі пот з твараў.

— Здарова, хлапцы! крыкнуў Ператыкін. Ну хараша-ж вы, сволачы, граеце!

Сафроныч і ты тутака?

— Ад восені ў музыкальным гуртку лічуся, сказаў гобой у паласатай кепцы.

— Э-э-э... ды тут вось і Савенка і Ягорчык і Ручкін..

— Але, але — сказаў дырыгэнт — усе свае хлапцы з муз-гуртка.

Якая гэта мэлёдыя? сказаў бас раскрываючы ноты? Апошнім мы „Прэабражэнскі марш" ігралі.

— Прэабражэнскі? ахнуў Ператыкін. Гэта шчэ той каторы пры цару...

— Але, але каторы.. Пасьля „Дунайскія хвалі" гралі, вось выданьне 1968 году. Далей -„польку-матылёк".. „хіавяту"...

— „Польку-матылёк... „хіавату" замарматаў Ператыкін. Чэрці! Ды што-ж гэта такое? Я думаў нашае гэта, новае... Дык гэта-ж выходзіць я пад „Польку матылёк" сьлязу пушчаў?

Дырыгэнт пастукаў палочкай.

— Венскі вальц № 208!

Ператыкін плюнуў і адыйшоў прэч..

*З расейскага пералажыў Б.*

# Тутэйшая хроніка.

— **ВАЯВОДА п. БЕЧКОВІЧ У ВІЦЭ-ПРЭМ'ЕРА БАРТЭЛЯ.** 17 жніўня віцэ-прэм'ер Бартэль прыняў прабываючага ў сталіцы Навагрдзкага ваяводу Бечковіча, які прадставіў агульны стан ваяводзкай гаспадаркі.

— **ВЫЕЗД п. КІРТЫКЛІСА ДА ВАРШАВЫ.** 16 жніўня быў выкліканы па службовым справам да Варшавы кіраўнік ваявудзкага аддзелу безпячэнства п. Кіртыкліс. Паварот яго чакаецца каля суботы.

— **ПАЧАТАК ШКОЛЬНАГА ГОДУ.** Школьны куратарыум выпусьціў адозву да насяленьня, у якой паведамляецца, што дзеці, радзіўшыяся ў 1914 — 1920 г., павінны быць з пачаткам школьнага году запісаны ў школы, бо ў праціўным выпадку бацькі будуць адказываць перад судом.

# ЖЫЦЬЦЕ ПРОВІНЦЫІ.

## Праца Прасьветы.

На ст. Новаельня, Дварэцкай гміны Навагрдзкага пав. ў салі „Огніска Колеёвага“ ў суботу 6 жніўня г. г. адбыўся спэктакль, наладжаны выязной трупай гуртка Беларускага Таварыства „Прасьветы“ ў м. Дзятлаве. Была пастаўлена і адыграна п'еса „Страхі Жыцьця“ Фр. Аляхновіча ў 3-х актах. У часе выязду трупы з м. Дзятлава ў Новаельню з мэтай пастаноўкі спэктаклю, пайшоў вялікі дождж, трываўшы да самага ранка. Ня гледзячы на дрэнную пагоду глядзельнікоў сабралося шмат. П'есу адыгралі вельмі добра. У часе ігры некаторыя не маглі ўстрымацца ад слёз і плакалі, а па сканчаньні доўга акляскалі. Артысты былі засыпаны пукамі кветак. Вельмі добра гулялі ў ролі бацькі „Сымона“ Мікалай Белуш, — маткі „Альжбеты“ — Мар'я Сасінская, — дачкі „Юзі“ — Надзя Чырвоная, сына „Алеся“ — Сочя Чырвоная, жаніха Юзі „Казюка“ — Янка Белуш. П'еса гулялася пад рэжысэрствам Александра Лазоўскага. Спэктакль закончыўся музыкай струннага аркестру. П'еса зрабіла вялікае ўражаньне на глядзельнікоў, якія прасілі часьцей ставіць у Новаельні беларускія спэктаклі. Кіраваў вечарынай адпаведны кіраўнік Уладзімір Гарбун.

Трупа выезжае 14 жніўня ў м. Молчадзь Баранавіцкага пав., 21 га ў м. Казлоўшчыну Слонімскага пав., з мэтай пастаноўкі спэктакляў і залажэньня аматорскіх кружкоў на мейсцох.

*„Прысутны“*

Ст. Новаельня
7 жніўня 1927 г.

## В. Казарэзы.

(*Івенецкае гміны*).

Нашым войтам — п. Адамам Канажэўскім пакуль што гміна задаволена У гміне парадак куды лепшы цяпер, як пры старым войце. Я ўжо пісаў у Раду і ў „Прасьвету“, каб у нашай школе, якая ёсьць у Казарэзах, быў-бы вучыцель, які выкладаў-бы па польску і па беларуску і каб нашых дзяцей праваслаўных вучылі-б Закону Божаму, бо ў школу ходзяць, а маліцца ня ўмеюць. Каталіцкіх дзяцей вучыцелька вучыць рэлігіі, а праваслаўных адпраўляе да хаты. Сьвяшчэнік наш прыяжджаў некалькі разоў у тым годзе, а ў гэтым ні разу, бо ён ёсьць так сама нядобры чалавек і ўсё стогне, што яму трудна жыць.

3-га жніўня пранёсься вялікі віхар і град пабіў і папсаваў усе пасевы, якія былі недажатыя.

*Янка Л.*

# Пісьмо у рэдакцыю.

*Паважаны Пане Рэдактар!*

Прашу зьмясьціць у пав. газэце „Беларускае Слова“ наступнае:

У № 33 „Нашае Праўды“ у карэспандэнцыі з Сіняўкі аб выбарах у самаўрады, газэта падае ўсякую ілжу і брахню, выдуманую з дурной, хоць вялікай галавы грамадаўскага кар. і між іншым робіць закід нашым шчырым працоўнікам на роднай культуры і змагаром з цемраю нашага сялянства за лепшую будучыню нашае Бацькаўшчыны: Ярошу і Шыбуту, называючы іх „Паўлюкевічаўцамі“. Так ня буду гэтага адкідаць, бо добра знаю абодвых, добра ведаю, што яны працуюць пад сьцягам Б. Н. Р. на чале якой стаіць паважаны і ўсім добра ведамы ў Сіняўцы п. Паўлюкевіч.

П. п. Шыбут і Ярош маюць вялікія ўплывы і паважаньне між сваіх грамадзян, аб чым сьведчыць ясна той факт, што абодвы стаяць на чале сваіх гурткоў „Прасьветы“ на становішчы старшыні, куды былі выбраны аднагалосна ўсімі сябрамі. Дзякуючы нашым паважаным Шыбуту і Ярошу маем ужо ў сваей ваколіцы кругом на вёсках гурткі „Прасьветы“, пры якіх адчынены бібліотэкі, чытальні дзе нашы сяляне кожную свабодную часіну карыстаюцца кніжкамі і газэтамі, ці, інакш кажучы, маюць духовую страву. Апрача гэтага пры вялікай працы, а такжа здольнасьці Шыбут ў Дунайчыцкім гуртку арганізаваў драматычную трупу любіцеляў—аматараў, якая ў сваей вёсцы перагуляла ўжо ўсе творы нашых пісьменнікаў у роднай мове, якія толькі меліся ў віленскіх кнігарнях, і гэтым самым Шыбут свой гурток паставіў на адпаведную вышыню, здабыў папулярнасьць сярод нас і ўсіх сялян, бо бачым, што шчыра працуе для лепшага заўтра, і ў доказ хіба ня трэба даваць фактаў, якое мае вялікае значэньне тэатр на вёсцы. Апрача сваей вёскі бачылі Шыбута з ягонай трупай у многіх іншых вёсках, як, напр., Слабада, Туча а нават і ў тваім родным мястэчку Сіняўцы, пане карэспандэнце! Тут ужо хіба ясна кожнаму і табе дурному карэспандэнту аб працы Шыбута, бо дбае ён ня толькі аб сваей вёсцы, а наагул аб ўсіх нас цёмных сялян, маючы сувязь з цэнтрам „Прасьветы“ і трымаючы цесны контакт з Старшынёй Беларускай Нацыянальнай Рады Др. Паўлюкевічам, і за гэта ім чэсьць, паважаньне, што цьвёрда стаяць і змагаюцца за нашу Нацыянальную ідэю ў лучнасьці з яе правадыром.

Дык вось, пане карэспандэнце „Ілжывае Няпраўды“, ты, паночку, брэшаш як кажа брэхаць табе твая „Ня-праўда!..

Але, пане карэспандэнце, калі мы запытаемся пана: „Што нам зрабіў дзеля палепшаньня быту нашага цёмнага сялянства? І наагул, што зрабіла твая „Праўда“ і Грамада ў Сіняўцы„? Дык сьмела дамо адказ, што нічога добрага, апрача благога, як будзе відаць із ніжэй паданага факту аб выбарах у самаўрады, бо пішучы гэта, маю на думцы тыя ж самыя выбары, хоць крыху і адыходжу ад тэмы. Дзякуючы пав. Старшыне Б. Н. Рады п. Паўлюкевічу мы мелі у свой час усю прадвыбарчую літэратуру, з якой мы скарысталі і маем цяпер сваю гмінную Раду, зложаную з беларусаў нацыяналістаў, але памыліўся, паночку, бо не грамадаўцаў! А па складу Рады відаць, якая яна, бо ў яе ўвайшлі гэткія ідэйныя працаўнікі Б. Н. Р. і „Прасьветы“: як Ярош, Шыбут, Мілішкевіч, Шлецкі, Забароўскі і Конон, рэшта беларусаў, звычайныя сяляне зусім ня прыхільнікі Грамады, а добрыя паважаныя сяляне. Будучы самі на выбарах мы бачылі, як за Яроша і Шыбута цьвёрда стаялі іх выбаршчыкі і яны прайшлі не апошнімі, як брэша грам. пісака, а сярэднімі №№, бо мелі пэўнасьць быць выбранымі, але пан Нашапраўдавец, маючы столькі сваіх сяброў на шпальтах „Нашае Праўды“, нават ня быў дапушчаны сялянствам да выбараў валаснога сабраньня, а бегаў, як цюцька, каля будынку гміны і агітаваў... Але дарма... Як відаць, вельмі добра любяць сяляне пана і „Нашу Праўду“. Мусіць яе і цябе, паночку, любяць толькі сіняўскія Бэркі, Хайкі, Хамкі, Шлёмкі ды Ароны, бо дзякуючы табе, беларусе, да валаснога сабраньня іх гэтулькі напакавалася Вось дык шчыры – беларус, які пастараўся абаламуціць сваіх сялян і напхаць у выбаршчыкі жыдоў, ад якіх пасьля атрымаў кукіш з маслам.

Дык вось, паночку, ня толькі ніхто не „каецца“, што ідзе пад сьцягам Б.Н Р., а наадварот — вельмі задаволены, як сяляне, так і радныя. А ты, паночку, быў адзін з сваею „Праўдаю“ так і астаўся, і нос не Д ру Паўлюкевічу, а пану, бо нават самы лепшы твой калежка Бэрка і той пакінуў цябе, бо быў ты патрэбны тады, калі яму трэба было Арона правясьці ў Раду.

Дык, пане карэспандэнце, радзім пану кінуць пісаць гэную ілжу ды яшчэ выдаваць яе як бы ад сялянства, бо гэта ўжо ашуканства... За Юдавы Срыбнікі прадаў жыдом, свае селянства, як калісь прадаваў палякам вызваленцам а цяпер сваімі „Праўдамі“ прабуеш баламуціць людзей.

Адно слова — грамадавец, які вельмі яскрава паказаў сябе! Як відаць, гэткая і „Наша Праўда“, які карэспандэнт. Дык цяпер ясна, чаму „Наша Праўда“ беларусоў шчырых робіць не беларусамі.

І так абрыдла гэтая „Праўда“ ўсім, што трудна выказаць. І ўсялякую гадасьць і ілжу пішуць, і паліцыя коса глядзіць. А яны ўсё шлюць і шлюць дарма гэтую гадасьць. Дык лепш было-б, каб вы з сваімі „Праўдамі“ зусім ня сунулі носу да нас, бо прайшлі часы панаваньня Грамады і пэўне, што ўжо болей ніколі ня прыйдуць.

*Беларус — Нацыяналіст.*

*Паважаны Пане Рэдактар!*

Будзьце ласкавы зьмясьціць гэтых некалькі радкоў. У Луцкевічавай часопісі „Наша Праўда“ (№ 35) зьмешчана ананімная заметка пад загалоўкам „смычка“, дзе мяне, як быўшага дэлегата Б. С С. называюць дэфэнзыўшчыкам, за тое, што я выйшаў з партыі сель-саюзу і прылучыўся да Бел. Нац. Рады. Усім добра ведама, што Бел. Нац. Рада выбраная Зьездам Заходняй Беларусі, зьяўляецца партыяй праўдзівай і мы, сяляне, гуртуемся каля яе. Заяўляю, што я моцна стаю на нацыянальным грунце і змагаюся за сваю ідэю і пашыраю беларускую культуру. Заяўляю, што пададзенае „Праўдай“ ёсьць ілжа.

З пашанай

10 VIII 1927 г. *А. Гордзей.*

*Паважаны Пане Рэдактар!*

Прашу зьмясьціць наступнае: У папярэднім нумары Вашае газэты № 26 „Беларускае Слова“ у пратэсьце ад 5 арганізацыяў ад імя сяброў „Хаткі“ падана на пратэсьце М. Чыжэўская. Гэтым заяўляю, што сябрам „Хаткі“ не састаю, як і сябрам іншых чатырох арганізацыяў і лічу, што мае прозьвішча было зьмешчана мусіць па абмылцы.

*М. Чыжэўская.*

Дня 17/VIII—27 г.

*Ад рэдак.:* Прозьвішча п. Чыжэўскай было выдрукавана пад пратэстам абмылкова замест падобнага прозьвішча п. Чайкоўскай, фактычнага сябра „Хаткі“, ў той час, як п. М. Чыжэўская сябрам „Хаткі“ ніколі не састаяла і не састаіць.

# Паштовая скрынка.

Тарашкевічу з Чарнолішак, Стэфановічу з Слабады, Янкоўскаму з Адамчука. — Просім паноўна прыслаць адрэсы і выразна зазначыць вашу пошту, бо пошта Міцкуны адмаўляецца даручаць вам газэты.

А. Гаранятнік, — карэспандэнцыя ня будзе зьмешчана, пакуль ня пададзіце для рэдакцыі дакладнага адрэсу.

Ю. Стэблеўскі — газэту высылаем

Гіп. Цытко, Мік. Кохан, П. Пашкоўскі, І. Мысьліцкі, М. Семеновіч, Я. Сьвітло, Ан. Міхальчук, Я. Рамук, Ц. Горбачык, Міх. Андрэйчык, Я. Мацкевіч. — пробныя нумары высылаем.

Гуртоk „Прасьветы“ ў Баранавічах, — газэту высылаем.

Мік. Пракапеня, — №№ 24, 25, 26 высланы і ў далейшым газэта будзе высылацца.



# АЛЕСЬ ГАРУН
# І ЯГО ТВОРЧАСЬЦЬ.

(*ЛІТЭРАТУРНЫ НАРЫС*).

„Ты, мой брат, каго зваць Беларусам,
„Роднай мовы сваей не цурайся;
„Як ня зрокся яе пад прымусам,
„Так і вольны цяпер не зракайся..“

*А. Гарун.*

Алесь Гарун, запраўднае прозьвішча якога *Аляксандар Прушынскі*, урадзіўся 12 сакавіка 1887 году, дык у сакавіку сёлетняга году беларускае грамадзянства сьвяткавала *40-сыя ўгодкі ад дня нараджэньня* гэтага выдатнага песьняра. Радзіўся ён ў Менску на Багадзельнай вуліцы у работніцкай сям'і.

„Бацькі яго - кажа М Гарэцкі у сваей Гісторыі Беларускае Літэратуры — Валадзімір Прушынскі і маці Зоф'я (з роду Жывіцаў) былі тыповыя прадстаўнікі працоўнай, простанароднай грамады менскіх беларусаў — каталікоў, спрадвечных жыцельнікаў места“. Гэткім чынам можам назваць А. Гаруна прадстаўніком пролетарыяту.

Дзякуючы вялікай сям'е і малым заробкам жылі Прушынскія вельмі бедна, дык ўжо з малалецтва праходзіў Алесь суровую жыццёвую школу і адчуваў на сваей скуры рэзультаты соцыяльных няроўнасьцяў.

Яшчэ, будучы малым дзіцянём, вызначаўся ён вялікімі здольнасьцямі і маючы пяць год толькі навучыўся ўжо чытаць па польску і па расейску, а на сёмым пачаў хадзіць у гарадзкую прыхадзкую школу. Скончыўшы яе, ён пасьля пэўнага часу паступае у менскую школу рамесьляных вучняў і прабыўшы тамака 3 гады, канчае яе па дрэвааддзелачнаму аддзяленьню. Гэты выбар рамесьляніцкай кар'еры быццам пераносіць Гаруна у сфэру мяшчанства, але гэта толькі ільлюзыя, бо той, хто стаіць бліжэй да жыцьця меставых мас, ведае, што паміж доляй работніка і дробнага рамесьляніка няма шака вялікшай рожніцы: тая-ж самая барацьба за кавалак хлеба, той-жа самы голад, холад і пагарда у людзёў!

Падчас свае вучобы малы Прушынскі выяжжаў заўсёды на вакацыі да сваей цёткі на вёску, памагаючы ей ў гаспадарцы.

Гэты момэнт ёсьць вельмі важным для далейшага духовага разьвіцьця нашага песьняра; жыцьцё на вёсцы азнаямляла яго — дзіцянё места, з сялянскім бытам і заняткамі ў полі і на ральлі, з хараством роднае прыроды, з гаротнай доляй ягонага брата — шэрага сярмяжніка...

З 16-ці год (знача з 1902 году, ў якім скончыў ён рамесьленую школу) працаваў ён як сталяр у рожных майстэрнях Менска і гэтак прабыў бязвыязна ў месьце аж да 1907 году. Праз увесь гэты час ён шмат чытаў, каб гэтак папоўніць прабелы сваей веды і пашырыць кругазор. Жывучы у цяжкіх матар'яльных абставінах і бачучы ўкруг сябе гэткую-ж галоту, як і сам, — ня дзіва, што поэт наш быў настрояны рэвалюцыйна і ў 1904 годзе ўступіў ў менскую арганізацыю соцыялістаў - рэвалюцыянэраў, вядучы ажыўленую пропагандна - арганізацыйную дзейнасьць, асабліва сярод вучнёўскай моладзі. Але наступіў фатальны дзень *17-га сакавіка 1907 г.* У якім пераламалася ўсё дасюлешняе жыцьцё песьняра; поэт-агітатар быў накрыты паліцыяй у конспіратыўнай друкарні; яго арыштавалі, пасадзілі ў турму і аддалі пад суд. Пасядзеўшы пэўны час у менскім вастрозе, поэт наш быў пераведзены у віленскі лукішскі вастрог і тамака вясной 1908 г. быў засуджаны на катаргу, якую пасьля замянілі яму на засланьне у Сыбір.

Саслалі Гаруна у Кірэнскі павет, Іркуцкай губэрні, дзе працаваў ён спачатку як сталяр і плотнік, а пасьля паступіў у адно з параходзтваў, працуючы тамака да вясны 1914 г. калі „на маніфэсту“ быў запісаны ў сяляне і атрымаў права жыць па ўсёй Сыбіры. З 1914 году Прушынскі працуе вадалівам на раке Лене і тутака на баржы № 18 рыхтаваў ён да друку першы зборнік сваіх вершаў п. н. „*Матчын Дар*“, які выслаў ў Вільню у восені 1914 г.

Неспакойны дух песьняра, а мо' ахвота направіць сваё цяжкое матэр'яльнае становішча, — не даюць яму сядзець доўга на адным мейсцы і вось ужо ў 1915 г. бачым мы яго на прыісках ў Бадайбо, дзе ён і прычакаў вялікае расейскае рэвалюцыі 1917 г. У часы керэншчыны яго, як заслужонага рэвалюцыйнага дзеяча выбіраюць тамака на рожныя адказныя становішчы і толькі ў верасьні 1917 г., пасьля 9-ці гадовай адсутнасьці, — пападае Прушынскі ў Менск, прыгнечаны, сумны, з папсаваным ссылкай здароўем (сухоты), але з колішняй сваей энэргіяй

З вялікім жарам і захопленьнем кідаецца ахвярны песьняр у вір рэвалюцыйных падзей, няўтомна стараючыся выкарыстаць іх дзеля беларускага дзяржаўнага будаўніцтва. Як выдатны грамадзкі працаўнік, ён як і раней ў Сыбіры займае тутака цэлы рад высокіх пастоў у рожных беларускіх установах Менску ды зьездах, між іншым з'яўляючысь: сябром Вялікай Беларускай Рады, віцэ-старшынёй Ўсебеларускага Кангрэсу у Менску і рэдактарам „Беларускага Шляху“. І вось 28-га ліпня 1920 году абрываецца раптам ніць ягонага працоўнага жыцьця, талентны поэт паміраe ад крываўкі ў далёкім Кракаве ў які закінулі яго ваенныя падзеі.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Поэтыцкія здольнасьці выяўляў А. Гарун ўжо замалку, але спачатку пісаў ён вершы па расейску і пераважна ў гумарыстычным тоне. Калі ён ў 1904 г. увайшоў у партыю, творчасьць ягоная ўраз-жа паглыбілася, прыймаючы паважны рэвалюцыйны кірунак. Першы раз пабачыў ён беларускае друкаванае слова у 1903 ці 1904 годзе, калі у рукі яго прыпадкова трапіла поэма „Гапон“ Марцінкевіча, друкаваная лацінкай. Падзея гэта выклікала вялікае ўражаньне на песьняра, узварушаючы яго ажно да сьлёзаў і вось незабавам, пад уплывам неспазнанага дасюль хараства роднай мовы, поэт наш пачынае тварыць па беларуску.

Першыя беларускія вершы Гаруна з'яўляюцца яшчэ ў 1905 — 6 гадох, пісаны яны былі на тэмы рэвалюцыйныя, сацыяльныя але нажаль не захаваліся. У гэтым часе значны ўплыў мелі на яго вершы Цёткі, гэткай-жа, як і ён запальнай рэвалюцыянэркі; ейныя ананімныя адозвы і лістоўкі энэргічна пашыраў Гарун, разам з „Нашай Ніваі“ і іншай агітацыйнай літэратурай.

Турма і засланьне ў Сыбір (1907—1917) выклікалі вялікі перелом у душы песьняра, туга за родным краем, суровая прырода чужой і негасьціннай старонкі, слабое здароўе, благія матэр'яльныя абставіны, цяжкая работа, цёмная будучыня, а нрадусім *адзінота*, — разьвіваюць у ягонай душы *элемэнт рэфлексыйны*, (развважальны), думка ягоная *паглыбляецца*, а з ёю паглыбляецца і ўся творчасьць Гаруна: туга па далёкай Бацькаўшчыне узмагае патрыятычныя пачуцьці аўтара; большая, чымся раней, колькасьць вольнага часу дае магчымасьць лепшай апрацоўкі паасобных вершаў, шляхам стараннай шліфоўкі іх; адзінота выклікае цэлы рад глыбока-філязафічных і адначасна з тым мастацкіх па форме і зьместу паэтыцкіх імпрэсыяў, – словам побач з *Гаруном — рэвалюцыянэрам*, якога мы ведалі дасюль, тутака, у гэтай панурай атмасфэры кары. вырастае прад намі Гарун новы і незнаёмы: *Гарун — Філязоф, Гарун — Мастак, Гарун — Містык!*

Падчас вайны і ў першую пару рэвалюцыі (1914 — 1918 г. г.) Гарун піша вельмі мала, спачатку прыгнечаны, ахапіўшай тады Эўропу атмасфэрай крыві і сьмерці, а пасьля захопляны расейскім рэвалюцыйным рухам 1917 г.

З 1918 году творчасьць яго ізноў узмагаецца, але ажыўленая грамадзкая дзейнасьць песьняра вельмі — ёй замінае, ўсьцяж адрывая Гаруна ад яго літэратурных заняткаў.

Акрамя поэзыяў, Гарун пісаў гэтак-жа і прозай пад псэўдонімам: *І. Жывіца*, узяўшы яго ад дзявочага прозьвішча свае маткі з дому Жывіцы, а ў апошнія годы свайго жыцьця дык напісаў яшчэ і пару п'есак для дзіцячага тэатру.

Канчаючы гэтым агульны агляд літэратурнай дзейнасьці Гаруна прыгледзімся цяпер бліжэй паасобным яго творам

(*Канец будзе*).

ЯЗЭП СЬВЕТАЗАР.

Адказны Рэдактар Т. Вернікоўскі. Друк. І. Баеўскага Вільня, Мостовая 9. Выдавец Беларуская Нацыянальная Рада.